Песню бярыце з сабою...

КАЛЫХАНКА ДЛЯ ЦЯБЕ

Рубрыку вядзе Яўген КСЯНЕВІЧ.
evgenyksenevich@gmail.com

Мікола Шабовіч (нар. у 1959) — выбітны беларускі паэт, паэт-перакладчык, філолаг і педагог. Член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Уладальнік рэспубліканскай літаратурнай прэміі «Залаты купідон», узнагароджаны медалём Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру» і нагрудным знакам «За ўклад у развіццё БДПУ».

Аўтар кніг, артыкулаў, паэтычных зборнікаў «Дом», «Яшчэ пакуль не лістапад», «Падары мне сваю адзіноту», «Мая надзея», «Прыколы ад Міколы», «Маладыя мроі маладога лета». На вершы Міколы Шабовіча напісана больш як 180 песень.

Мне пашчасціла больш за 30 гадоў сябраваць з выдатным паэтам і чалавекам Міколам Шабовічам. 4 студзеня 2019 года яму спаўняецца 60 гадоў, жадаю яму здароўя, творчага натхнення і новых здабыткаў у літаратуры.

Вершы — Мікола ШАБОВІЧ, музыка — Яўген КСЯНЕВІЧ.

Уступ:

Куплет 1:
Спі, не ўспамінай,
Што прамчаўся май,
Што ля дрэў, кустоў
Жаўтапад лістоў.

Прыпеў:
Да рукі рука,
Да шчакі шчака,
Да пляча плячо —
Спі, маё дзяўчо.

Куплет 2:
Ты засні, засні,
Мо прысняцца дні,
Як, нібыта ў сне,
Ты знайшла мяне.

Пройгрыш.

Куплет 3:
Між дарог-шляхоў
Я цябе знайшоў.
І да зор ляцеў
Калыханкі спеў.

Куплет 4:
Хай прысніцца ў сне:
Ты прабачыш мне
За самотны дзень
І нязбыт надзей.



Будзь у курсе!

ПАВЫСІЎСЯ КОШТ ПРАЕЗДУ

ў грамадскім транспарце трох абласцей

Адпаведныя рашэнні аблвыканкамаў змешчаны на Нацыянальным прававым інтэрнэт-партале. Яны ўжо ўступілі ў сілу.

Так, павялічыўся кошт праезду ў гарадскім і прыгарадным транспарце Віцебскай вобласці — на 5 капеек. Кошт месячнага праязнога на аўтобус у гарадах з насельніцтвам звыш 250 тысяч чалавек складзе 24,75 рубля; ад 50 да 250 тысяч — 24,09 рубля; менш за 50 тысяч — 21,03 рубля. Столькі ж будзе каштаваць праязны на тралейбус ці трамвай для гарадоў, дзе выкарыстоўваецца такі від транспарту. За праязны на тры віды — аўтобус, трамвай, тралейбус — трэба будзе аддаць 39,38 рубля.

Павялічыўся і кошт праезду і перавозкі ручной паклажы ў гарадскім грамадскім транспарце Гродзенскай вобласці. Цяпер ён на праезд на звычайных і хуткасных маршрутах вырасце да 55 капеек, а пры набыцці ў кіроўцы — да 65 капеек. Кошт месячнага праязнога ў Гродне (на аўтобус ці тралейбус) павялічыцца да 24,75 рубля, дэкадны — да 8,71 рубля. У Лідзе рост адбудзецца адпаведна да 24,09 рубля і 8,47 рубля, у іншых гарадах — да 21,03 рубля і 7,37 рубля. Апроч таго, зменяцца гранічныя максімальныя тарыфы на прыгарадныя аўтамабільныя перавозкі пасажыраў, багажу і ручной паклажы ў рэгулярных зносінах.

P.S. *Як стала вядома, аналагічнае рашэнне аб падаражанні праезду ў грамадскім транспарце было прынята і ў Брэсцкай вобласці.*

Сяргей РАСОЛЬКА.

Даты | Падзеі | Людзі

1 СНЕЖНЯ

У краіне

1939 год — нарадзіўся (вёска Стайкі Аршанскага раёна) Уладзімір Пятровіч Платонаў, беларускі савецкі вучоны-матэматык, член-карэспандэнт, акадэмік НАН Беларусі, АН СССР, Расійскай АН, прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, замежны член Індыйскай нацыянальнай Акадэміі навук. З 1971 года — загадчык лабараторыі Інстытута матэматыкі АН Беларусі, у 1977—1992 гадах дырэктар гэтага інстытута. У 1987—1992 гадах прэзідэнт АН Беларусі, у 1992—1996-м — галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута матэматыкі НАН Беларусі. Аўтар больш чым 150 навуковых прац. Даследаванні па алгебры, алгебраічнай геаметрыі, лінейных групах і тапалагічнай алгебры. Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола, Ленінскай прэміі.

1983 год — на будаўніцтве першай чаргі Мінскага метро завершаны горнапраходчыя работы.

У свеце

1792 год — нарадзіўся Мікалай Іванавіч Лабачэўскі, рускі матэматык, стваральнік неэўклідавай геаметрыі, мысліцель-матэрыяліст, дзеяч народнай асветы. З 1811 года працаваў у Казанскім універсітэце (з 1827-га — рэктар). Аўтар навуковых прац па алгебры, геаметрыі, матэматычным аналізе, механіцы, фізіцы і астраноміі. Памёр у 1856 годзе.

1890 год — нарадзіўся Васіль Канстанцінавіч Блюхер, савецкі ваенны дзеяч, Маршал Савецкага Саюза (1935). У пачатку Першай сусветнай вайны пайшоў на фронт, за баявыя заслугі ўзнагароджаны двума Георгіеўскімі крыжамі. У 1921—1922 гадах — ваенны міністр, галоўнакамандуючы і член Ваеннага савета Народна-рэвалюцыйнай арміі Далёкаўсходняй народнай рэспублікі, кіраваў рэарганізацыяй арміі, разгромам белагвардзейцаў пад Валачаеўкай, узяццем Спаска ў 1922 годзе. У 1924—1927 гадах — галоўны ваенны саветнік пры кітайскім рэвалюцыйным урадзе, удзельнічаў у правядзенні Вялікага Паўночнага паходу. Улетку 1938 года, у перыяд баявых дзеянняў супраць японскіх мілітарыстаў каля возера Хасан, камандаваў Далёкаўсходнім фронтам. Памёр у 1938 годзе.

1896 год — нарадзіўся Георгій Канстанцінавіч Жукаў, савецкі ваеначальнік, Маршал Савецкага Саюза, Герой Савецкага Саюза. У 1926—1931 гадах выкладаў ваенна-дапрызыўную падрыхтоўку ў БДУ, у 1930—1936-м камандаваў кавалерыйскімі дывізіямі ў Мінску і Слуцку, у 1938—1939 гадах займаў пасаду намесніка камандуючага кавалерыйскімі войскамі Беларускай ваеннай акругі. У час Вялікай Айчыннай вайны быў намеснікам Вярхоўнага галоўнакамандуючага, распрацоўваў планы найбольш буйных аперацый, кіраваў прарывам блакады Ленінграда, дзеяннямі войскаў у Курскай бітве, вызваленнем Беларусі, Вісла-Одэрскай аперацыяй, узяццем Берліна. У 1945 годзе прымаў парад Перамогі. У 1955—1957 гадах — міністр абароны СССР. Памёр у 1974 годзе.

1913 год — на заводах амерыканскай кампаніі «Форд» быў запушчаны першы ў свеце канвеер па зборцы аўтамабіляў, вынаходніцтва якога прынесла сусветную славу інжынеру і аўтамабільнаму магнату Генры Форду.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.04	16.52	7.48
Віцебск —	9.01	16.35	7.34
Магілёў —	8.55	16.42	7.47
Гомель —	8.43	16.46	8.03
Гродна —	9.19	17.09	7.50
Брэст —	9.11	17.17	8.06

Месяц

Апошняя квадра 30 лістапада.
Месяц у сузор'і Шаляў.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Платона, Рамана.*
К. *Наталлі, Эдмунда, Элігіума.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

У Ігара былі настолькі неакрэсленыя планы на вечар, што ў краме ён купіў прэзерватывы, кнігу і шпаталь.

— Вы ведаеце, Яша, у кожнага мужчыны ўсё ж такі мусіць быць другая палова!

— Вы мне будзеце расказваць! Куды ж без яе? Першая то на рабоце, то стамілася, то ў яе галава баліць...

У дзіцячым садку кемлівыя выхавальніцы ў ціхую гадзіну прыдумалі конкурс для дзяцей: хто першы засне, таму можна не спаць!

Дыялогі ў сеціве.

— Я не зразумела, ты мой «Інстаграм» глядзіш увогуле?!

— Зараз адкрыю. Гэта твае ногі? Класна. А гэта што — катлеты? Божухна, як прыгожа!

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4519.
Нумар падпісаны ў 19.30 30 лістапада 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12